# Дэкларацыя ва імя жыцця на Зямлі

Зямля – гэта жывая істота, якая ўвесь час развіваецца. Кожная форма жыцця на зямлі з'яўляецца важнай часткай гэтай жыццёвай сутнасці. І ўсе мы павінны ўсведамляць, што з'яўляемся часткай гэтай глабальнай супольнасц і жыцця, усе мы маем агульную місію і адказнасць за будучае нашай планеты.

Кожнаму з нас неабходна адыграць сваю ролю ў развіцці нашай планеты і ,каб дасягнуць міра, кожны з нас павінен жыць згодна з нашай адказнасцю і абавязкамі. Да гэтага часу далёка не ўсе людзі на зямлі задаволены жыццём. Мы сутыкаемся з канфліктамі на ўсім свеце за валоданне прыроднымі рэсурсамі і за тэрыторыю. Гэтыя канфлікты маюць разбуральныя паследствы для акружаючага асяроддзя ў глабальным маштабе.

У той час, калі мы крочым у новае тысячагоддзе, мір ва ўсім свеце залежыць больш за ўсё ад абуджэння свядомасці кожнага індывіда чалавечай расы. Сягоння неабходна, каб кожны чалавек быў адказны за стварэнне міра і гармоніі ў сваім сэрцы. Мы ўсе маем агульную місію, якую неабходна выканаць. Мір ва ўсім свеце будзе пабудаваны тады, калі кожны член чалавечай супольнасці будзе ведаць аб нашай агульнай місіі, калі мы ўсе аб'яднаемся ва імя нашай агульнай мэты.

Да гэтага часу з пункту гледжання ўлады ,багацця, славы, ведаў тэхналогій і адукацыі чалавецтва дзеліцца на індывідуумы, краіны, арганізацыі, якія валодаюць усім гэтым, і ў якіх гэтага няма. Існуюць таксама адрозненні паміж тымі, хто дае і тымі, хто бярэ, паміж тымі, хто дапамагае і тымі, хто гэту дапамогу прымае.

Мы дэкларуем сваю прыхільнасць да пераадолення ўсіх гэтых адрозненней у адпаведнасці з новай канцепцыяй, якая будзе нашай асновай у дасягненні нашай мэты на пабудову міра ва ўсім свеце.

## Асноўныя прынцыпы

У новай эры чалавецтва будзе рухацца да света гармоніі, дзе кожны індывідум і кожная нацыя будзе здольна свабодна выяўляць свае індывідуальныя якасці, жывучы ў гармоніі адно з адным і з усім жывым на зямлі. Для ажыццяўлення гэтага пункту гледжання мы выстаўляем наступныя прынцыпы:

### 1. Паважанне жыцця.

Мы будзем будаваць мір, заснаваны на любові і гармоніі, дзе паважаюцца ўсе формы жыцця.

### 2. Паважанне адрозненней.

Мы будзем ствараць мір, у якім паважаюцца ўсе разнастайныя расы, этнічныя групы, рэлігіі, культуры, традыцыі і звычаі. Мір павінен быць месцам свабодным ад дыскрымінацыі або канфрантацыі, а ў сацыяльным, фізічным і духоўным плане – тым месцам, дзе ўсялякія адрозненні будуць высока ацэньвацца і дзе ім будуць рады.

**3. Падзяка і суіснаванне з прыродай.**

Мы будзем ствараць мір, дзе кожны чалавек ведае, што нам дадзена магчымасць жыць, дзякуючы благаславенню прыроды, мы павінны жыць у гармоніі з прыродай, выказваць падзяку ўсяму жывому на зямлі.

**4. Гармонія паміж духоўным і матэрыяльным.**

Мы будзем ствараць мір, заснаваны на гарманічнай раўнавазе паміж духоўнай і матэрыяльнай цывілізацыямі. Мы павінны адказацца ад нашай празмернай увагі да матэрыяльнага боку жыцця, каб даць росквіт здаровай духоўнасці. Мы павінны ствараць мір, дзе будуць цаніцца не толькі матэрыяльны дабрабыт, але і духоўныя багацці.

## Практыка

Мы будзем ужываць гэтыя прынцыпы ў практычным жыцці, кіруючыся наступным:

**Як індывідуумы:**

Мы павінны перайсці ад эпохі, дзе ўлада і адказнасць ускладаюцца на нацыянальныя дзяржавы, этнічныя групы і рэлігіі, у свет, дзе вышэй за ўсё стаіць чалавек. Мы працуем над ‘‘Эрай індывідуума’’ не ў сэнсе эгаізма, а як эра, дзе кожны чалавек гатовы прыняць адказнасць і выканаць сваю місію, як незалежны член чалавечай расы. Кожны з нас будзе выконваць гэту найвялікшую місію, каб прынесці любоў, гармонію і ўдзячнасць у свае ўласнае серца, і такім чынам прынесці гармонію ў свет у целым.

**У нашых спецыфічных галінах:**

Мы будзем строіць сістэму супрацоўніцтва, дзе мудрасць збіраецца разам, для таго, каб выпрацаваць самае лепшае з тэхнічных ведаў, навыкаў і здольнасцей у розных галінах, такіх як адукацыя, навука, культура і мастацтва, а таксама рэлігія, філасофія, палітыка і эканоміка.

**Як маладое пакаленне:**

У XX стагоддзі бацькі, настаўнікі і грамадства былі выхавацелямі дзяцей, а дзеці заўсёды знаходзіліся ў становішчы тых, каго навучаюць. У XXI стагоддзі дарослыя будуць вучыцца ў дзяцей такім цудоўным якасцям як цысціня, нявіннасць, ззянне, мудрасць і інтуіцыя, для таго, каб натхняць і паднімаць настрой аднаго аднаму. Падрастаючае пакаленне будзе адыгрываць галоўную ролю ў стварэнні міра для бліскучай будучыні.

**Няхай будзе мір чалавецтву ва ўсім свеце!**